# III Рэспубліканскі фестываль-конкурс даследчых праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый”: вынікі

У адпаведнасці з планам работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2023 год Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі быў праведзены заключны этап рэспубліканскага фестывалю-конкурсу даследчых праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый” (далей – конкурс).

Конкурс быў накіраваны на патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне навучэнцаў, далучэнне дзяцей і моладзі да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, вывучэнне рэгіянальных народных традыцый і развіццё дзіцячай даследчай творчасці ў галіне беларускага народнага мастацтва.

Конкурс аб’яднаў дзяцей, педагогаў, бацькоў у агульнай справе вывучэння, асэнсавання і папулярызацыі традыцый і культурных здабыткаў нашай Радзімы!

На рэгіянальныя этапы конкурсу было прадстаўлена больш за 460 праектаў, аўтарамі якіх сталі амаль 1 000 навучэнцаў і больш за 550 педагагічных работнікаў. У распрацоўцы праектаў прынялі ўдзел аўтарскія калектывы з 434 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

На заключны рэспубліканскі этап конкурсу прадстаўлена 63 праекта ў розных накірунках беларускага народнага мастацтва з усіх рэгіёнаў Беларусі: Брэсцкая вобласць – 13; Віцебская вобласць – 4; Гомельская вобласць – 10; Гродзенская вобласць – 9; Мінская вобласць – 11; Магілёўская вобласць – 12; г. Мінск і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі – 4.

На конкурс былі прадстаўлены калектыўныя і індывідуальныя праекты навучэнцаў у трох намінацыях “Культурныя традыцыі і абрады роднага краю”, “Музычная спадчына маёй Радзімы”, “Рукатворныя помнікі народнага мастацтва маёй краіны”.

Праекты распрацаваны аўтарскімі калектывамі з 63 устаноў адукацыі (з якіх 32 УДАДіМ) – гэта амаль 170 навучэнцаў. Значную ролю ў зберажэнні і трансляцыі народных традыцый адыгрываюць педагогі, якія ажыццяўлялі падтрымку і метадычнае суправаджэнне праектнай дзейнасці (больш за 100 педагагічных работнікаў).

Аўтары праектаў прадэманстравалі шырокае кола інтарэсаў – гэта вывучэнне фальклорнага мастацтва, народных песень, танцаў, інструментальнай творчасці, абрадаў, народнага тэатра, традыцыйных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка, мастацкі тэкстыль, роспіс, мастацкая апрацоўка саломкі і інш.), вывучэнне традыцыйнага побыту і народнай культуры свайго краю. Вынікам праектнай дзейнасці сталі як творчая рэканструкцыя – аднаўленне пэўных элементаў традыцыйнага мастацтва, так і стварэнне сучасных мастацкіх прадуктаў праз спалучэнне сродкаў народнай творчасці і сучасных тэхналогій.

Праектныя работы навучэнцаў уключалі: пашпарт праекта, абгрунтаванне актуальнасці і ідэі праекта, тэарэтычны матэрыял па тэме і яго сціслы аналіз, апісанне даследчай, творча-пошукавай дзейнасці (вывучэнне гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі, культуры і мастацкіх традыцый роднага краю, сустрэчы з носьбітамі, наведванне музеяў, знаёмства з асабістымі аўтарскімі калекцыямі і г. д.) і практычнай дзейнасці. Вопыт і вынікі былі прадэманстраваны ў відэароліках, у якіх аўтары прэзентавалі прадукты праектнай дзейнасці: творчую рэканструкцыю батлеечнага прадстаўлення, каляндарных, сямейных абрадаў і іх атрыбутыку, мастацкія вырабы дэкаратыўна-прыкладной творчасці, творы музычнага і харэаграфічнага фальклору і інш.

Экспертная камісія і журы конкурсу ўключала прафесіяналаў-экспертаў у галіне беларускага народнага мастацтва з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыялістаў Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, якія з вялікай увагай аднесліся да кожнай праектнай работы.

Ацэнка матэрыялаў ажыццяўлялася ў адпаведнасці з крытэрыямі конкурсу, улічваліся актуальнасць і значнасць работы, лагічнасць, паўната раскрыцця тэмы, самастойнасць даследавання, наяўнасць абгрунтаваных высноў, адпаведнасць рэгіянальным мастацкім традыцыям, творчае пераасэнсаванне народнай спадчыны, мастацкая выразнасць і якасць выканання.

Па выніках конкурсу эксперты выказалі заўвагі, тыповыя для некаторых работ: недастатковая даследаванасць тэмы і яе абгрунтаванне, недастатковае апісанне працэсу і зместу даследчай і практычнай дзейнасці ў рамках праекта, недастатковасць самастойнага асэнсавання тэмы і аналізу першакрыніц, недастатковае прадстаўленне вынікаў праектнай дзейнасці.

29–30 лістапада 2023 года ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі адбылася надзвычай важная і ўнікальная падзея – фестываль праектаў навучэнцаў, які быў прысвечаны Году міру і стварэння.

Фестываль праектаў – выніковы тур рэспубліканскага этапу конкурсу – уключаў творчыя абароны-прэзентацыі лепшых даследчых праектаў III Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу праектаў “Нашчадкі традыцый”. Па выніках папярэдняга (экспертнага) тура рэспубліканскага этапу конкурсу былі вызначаны лепшыя праектна-даследчыя работы (23 праекты).

Удзельнікі фестывалю-праектаў з розных рэгіёнаў Беларусі прэзентавалі вынікі праектнай творчасці, прадставілі выдатныя праекты ў розных кірунках беларускага народнага мастацтва.

Па выніках правядзення заключнага этапу рэспубліканскага фестывалю-конкурсу вызначаны пераможцы і прызёры, якія ўзнагароджаны дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: I ступені – 4, II ступені – 6, III ступені – 8, “За развіццё і папулярызацыю народнай спадчыны” – 5; дыпломамі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі – 40.

Рэспубліканскі фестываль-конкурс даследчых праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый” – гэта добры старт для развіцця творчых здольнасцей, даследчых кампетэнцый, фарміравання творчага мыслення, развіцця мастацкага густу, а таксама выдатны падмурак для падтрымкі і развіцця творчай ініцыятывы дзяцей і моладзі па выкарыстанні і распаўсюджванні мастацкіх традыцый рэгіёна, пашырэнні кола прыхільнікаў і аматараў беларускай народнай творчасці ў памкненні ведаць гісторыю сваёй краіны і шанаваць яе традыцыі.